# Журналістыка

У. А. ПАЛЯКОЎ

## ЧАЛАВЕК: ЯГО ДЗЕЙНАСЦЬ І СМІ

Асновай развіцця кожнай краіны з'яўляецца праца. Гэта дзейнасць чалавека, зарыентаваная на тыя вынікі, якія б адпавядалі патрабаванням грамадства ў сферы эканомікі. Аднак па даных Дзяржкамстата СССР у 1990 г. страты працоўнага часу ў прамысловасці і будаўніцтве дасягнулі 50 млн. чалавека-дзён. З-за гэтага недададзена на 5 млрд. руб. прадукцыі. У апошнім годзе ўзмацніліся інфляцыйныя, крызісныя працэсы, назіралася абсалютнае падзенне вытворчасці [1].

Безумоўна, адмоўную ролю адыгралі тут забастоўкі, міжнацыянальныя канфлікты. Сюды можна дадаць яшчэ і «парад суверэнітэтаў», які прывёў да развалу інтэграцыйных сувязей паміж рэспублікамі, і непаслядоўную дзейнасць урада СССР, іншыя аб'ектыўныя і суб'ектыўныя фактары.

Але статыстыкі чамусьці не звярнулі нашу ўвагу на вельмі значную, калі не галоўную, прычыну такога становішча, якая мае рысы суб'ектыўнага характару. Так, толькі ў Беларусі за апошні час удзельная вага заработнай платы ў даходах працаўнікоў скарацілася з 80 да 68 % [2]. Значыць, чалавек стаў яшчэ менш зацікаўлены ў выніках сваёй працы, яго не надта турбуюць клопаты аб прыросце нацыянальнага багацця, без чаго немагчыма быць гаспадаром у сваёй дзяржаве. Такім чынам, асабістыя і грамадскія інтарэсы за апошні год не толькі не падыйшлі да дыялектычнага адзінства, а наадварот, знаходзяцца ў глыбокай супярэчнасці. Адсюль і ўсе складанасці сістэмы «чалавек — рэвалюцыйная перабудова», бо яшчэ 150 гадоў таму Карл Маркс гаварыў, што як само грамадства стварае чалавека як чалавека, так і ён стварае грамадства [3].

Прычынай цяжкага становішча ў эканоміцы можна лічыць яшчэ адну акалічнасць, звязаную са сродкамі масавай інфармацыі. Як раней, так і цяпер яны падвяргаюцца нападкам з боку сіл, якія не жадаюць бачыць прэсу у ролі «чацвёртай улады». Гэта праяўляецца і ў тым, што СМІ працуюць ва ўмовах жорсткага манапалізму папернай вытворчасці, распаўсюджвання друку. Да таго ж журналісцкая дзейнасць не мае дакладнай юрыдычнай абароны. Вось чаму пад такім націскам, нягледзячы на Рэзалюцыю аб галоснасці XIX Усесаюзнай партканферэнцыі, Закон аб друку, работу Камітэта Вярхоўнага Савета СССР па пытаннях галоснасці, правоў і зваротаў грамадзян некаторыя выданні абмяжоўваюць сваю інфармацыю. Так, маладзёжныя рэспубліканскія газеты «Чырвоная змена» і «Знамя юности» з ліпеня 1989 па чэрвень 1990 года для той жа эканомікі адвялі ўсяго каля 6 і 5 % сваёй плошчы адпаведна. Новым формам гаспадарання і маёмасці, дзе творчая ініцыятыва чалавека раскрываецца з усёй паўнатой, абедзве маладзёжкі аддалі менш чым па аднаму працэнту плошчы кожная. Гэта, безумоўна перашкаджае выпрацоўцы арыенціраў эканамічных паводзін людзей, стварэнню новага эканамічнага мыслення. Таму што СМІ на звычайным узроўні не толькі адлюстроўваюць, але і фарміруюць грамадскую свядомасць.

Усе названыя прычыны магчыма ўдакладніць, калі звярнуцца да зместу тэрміна «чалавечы фактар». Аднак і да яго ў апошні год знізіўся інтарэс нават з боку навукі. Дарэмна, бо чалавечы фактар выступае рашаючай сі-

лай грамадскага развіцця, асновай матэрыяльнай і духоўнай вытворчасці. Недаацэнка ж гэтага будзе толькі спрыяць паглыбленню крызісу.

Паняцце «чалавечы фактар» узнікла ў ЗША на пачатку НТР, а ў 50-я гады атрымала звычную для нас назву. Пачаўшы з тэйлараўскай «малай свабоды дзеяння», з інтэнсіўнай нізкакваліфікаванай працы, інжынерная псіхалогія амаль за 70 год свайго існавання стварыла якасна новую рабочую сілу, здольную працаваць з камп'ютэрамі чацвёртага пакалення. Усё гэта яшчэ раз пацвярджае думку Энгельса аб тым, што грамадская вытворчасць «з аднаго боку — вытворчасць сродкаў да жыцця... з другога — вытворчасць самога чалавека»[4]. Таму постіндустрыяльнае грамадства ў выніку ўзняло чалавека на новы ўзровень па шкале каштоўнасцей грамадства. Не выпадкова у тых жа ЗША каля 60 % сем'яў адносяцца да сярэднезабяспечаных слаёў насельніцтва. Інакш кажучы, само грамадства масавага спажывання прымусіла змяніць погляд на чалавека, ператварыўшы яго з толькі сродка на пачатку НТР яшчэ і ў мэту.

У нашай краіне яшчэ павінна адбыцца НТР, «кадравая» рэвалюцыя. У сваім «развіцці» дзяржаўна-манапалістычны тып сацыялізму «усё больш ператвараўся па сваёй сутнасці ў архаічную, дакапіталістычную сістэму вытворчых адносін»[5], калі грамадства ўспрымалася «накшталт фабрыкі, чалавек — вытворчы фактар»[6]. Вынік такога позірку на чалавека асабліва востра выявіўся зараз, у перыяд ломкі старых адносін. У СССР 86,5 % бедных сем'яў, 7 млн. афіцыяльна прызнаных беспрацоўных, а па даных Міжнароднай асацыяцыі даследавання бяздомнасці і беспрацоўя, гэтая лічба як мінімум у два разы большая. Мы займаем 42-е месца ў свеце па інтэлектуальнасці падрастаючага пакалення.

Немалая «заслуга» у гэтым належыць сродкам масавай інфармацыі. У нашай прэсе знайшлі сваё адлюстраванне некаторыя з асноўных давіфатаўскіх законаў публіцыстыкі, сутнасць якіх зводзіцца да абмежавання, спрашчэння, паўтарэння матэрыялу, што дазваляе дастаткова эфектыўна маніпуліраваць грамадскай свядомасцю і выкарыстоўваць СМІ ў якасці інструментаў да ажыццяўленння панавання бюракратыі. Недахоп інфармаванасці людзей, аднамернасць публікацый, адсутнасць розных пунктаў гледжання не дазвалялі масам аб усім ведаць, меркаваць і ісці на ўсё свядома. Такая дзяржава, на думку Леніна[7], не можа быць моцнай. Дзяржаўна-манапалістычны сацыялізм і ягоная ідэалагічная сістэма на практыцы былі накіраваны на заглушэнне актыўных пачаткаў чалавека, на ўзнаўленне паслухмяных прыстасаванцаў і безыніцыятыўных згоднікаў. Зразумела, што падаўляючая колькасць савецкіх людзей наогул не жадала быць рухаючым фактарам гэтых працэсаў. Не жадала, але ўдзельнічала, бо чалавек не стаіць над працэсамі ў грамадстве, а знаходзіцца сярод іх, свядома ці не.

Рэцыдывы старога жывуць і сёння. Выяўляюцца яны ў адносінах дзяржавы да свайго народа, ягоных патрэбнасцяў. Відавочна, 5 % гадавога росту вытворчасці прадметаў спажывання недастаткова для змянення існуючай інфраструктуры, дзе галоўным спажыўцом выступае сама дзяржава. Пакуль не змяніліся адносіны дзяржавы да такіх сацыяльных груп, як пенсіянеры і моладзь. Антымаральныя адносіны бюракратызаванай дзяржавы выяўляюцца і да новай сацыяльнай групы — «чарнобыльцаў». Толькі ў лістападзе 1990 г. заснаваны Беларускі фонд міжнароднага супрацоўніцтва «Чарнобыль — сацыяльная абарона насельніцтва». Гэта праз чатыры гады пасля трагедыі?!

Не змяніўся падыход і да асобы, калі крытэрыем яе каштоўнасцей з'яўляецца «станоўчы» для бюракратычнай сістэмы набор якасцей. І працаўнікі СМІ тут, нягледзячы на Закон аб друку, зусім не выключэнне. Старшыня Камісіі Вярхоўнага Савета БССР па пытаннях галоснасці і правоў чалавека К. Каратчэня вельмі незадаволены «распеаразанымі» журналістамі, якія адважваюцца крытыкаваць нават членаў парламента. Вось ён і заявіў карэспандэнту БелТА, што неабходны беларускі Закон аб друку, зразумела больш жорсткі за саюзны. Аб гэтым паведаміла газета «Советская Белоруссия» 4 лютага 1990 г. ў матэрыяле «Гласность по-цензорски?»

Жывыя яшчэ суадносіны асабістых і грамадскіх інтарэсаў, калі дабрабыт чалавека мала залежыць ад стану спраў на яго прадпрыемстве. «Калі гаварыць аб іншых прычынах недаацэнкі чалавечага фактару, то да іх трэба аднесці прыярытэт эканамічных інтарэсаў, у выніку якіх сацыяльныя пытанні адсоўваюцца на задні план»[8].

Усё гэта і па сённяшні дзень знаходзіцца ў нашай свядомасці; таму што

чалавек — гэта свет чалавека, дзяржава, грамадства [9]. Такім чынам яго быццё выступае тут як матэрыялізаваная свядомасць.

Дык прычым тут чалавечы фактар? Прытым, што гэта катэгорыя грамадскай свядомасці [10]. Гэты фактар — дзейсны бок грамадскай свядомасці, «арганічнае адзінства свядомасці і дзейнасці». Свядомасць — не толькі розум, але і справа, і само грамадства — «прадукт узаемадзеяння людзей»[11]. Новае грамадства, да якога мы імкнемся, не выключэнне. Вось чаму з поўнай адказнасцю можна заявіць, што фарміраванне новага мыслення, новай грамадскай свядомасці і ёсць галоўная задача перабудовы.

Сродкі масавай інфармацыі ў гэтай сферы маюць велізарныя магчымасці. Газеты, радыё, тэлебачанне не толькі адлюстроўваюць масавую свядомасць, але і змяняюць яе. А «масавая свядомасць — гэта грамадская свядомасць, якая дзейнічае»[12]. Ператвараючы яе ў грамадскую сілу, СМІ падрыхтоўваюць, фарміруюць чалавека да актыўных дзеянняў, таму што масавая свядомасць, як прызнана некаторымі даследчыкамі, вызначаецца не столькі быццём, колькі сродкамі масавай інфармацыі. З'яўляючыся калектыўным прапагандыстам, агітатарам, арганізатарам, газета — журналістыка цалкам — уплывае на жыццё грамадства пры дапамозе чалавечага фактару, а зменена быццё — на грамадскую свядомасць і СМІ. У гэтым дыялектычным адзінстве апошнім адведзена вельмі важная роля: быць сродкам сацыяльнай сувязі.

Аднак друк, радыё, тэлебачанне не заўсёды могуць дастаткова эфектыўна выконваць гэтую ролю. З'яўляючыся толькі адным з асноўных камунікатыўных каналаў, СМІ зусім не ў ганарлівым адзіноцтве адлюстроўваюць і фарміруюць грамадскую думку. Таму нават недахоп (не гаворачы аб скажэнні) сацыяльнай інфармацыі папаўняецца калектыўным вопытам, чуткамі, што прыводзіць, як адзначыў у сваёй кнізе «Общественное мнение» М. К. Гаршкоў, да існавання ў краіне дзвюх грамадскіх думак: «думкі газет» і «думкі народа»[13]. Абмежаваная інфармацыя не эфектыўна таму, што яна не можа стымуляваць сацыяльную актыўнасць чалавека, бо не супадае з ягонай уласнай практыкай, з прыяўленнямі жыцця.

Адсюль вельмі важна ў газетах даваць як мага больш шырокую панараму жыцця, выкарыстоўваючы пры гэтым усе жанры савецкай журналістыкі. Менавіта спалучэнне інфармацыйнага, кіраўнічага і эстэтычнага бакоў журналісцкага твора можа прывесці да патрэбнай эфектыўнасці і дзейснасці, што было падкрэслена ў кнізе «Эффективность партийной публицистики» Б. В. Стральцовым [14].

На жаль, рэспубліканскія выданні грашаць вузкай накіраванасцю сваёй дзейнасці. Так, «Знамя юности» займаецца ў асноўным палітыкай, «Чырвоная змена» лічыць галоўнай для сябе маральную сферу. Са старонак рэспубліканскіх газет амаль зніклі такія жанры, як нарыс, замалёўка, праблемны артыкул. Інакш кажучы, тыя жанры, якія найбольш эфектыўна закранаюць дзве асноўныя функцыі грамадскай думкі: рэгулятыўную і выхаваўчую. Асабісты і групавы ўзроўні масавай свядомасці не атрымліваюць патрэбнага ўздзеяння. І газеты не могуць стварыць умоў для з'яўлення новых сацыяльных тыпаў чалавека, таму, жадаючы ці не, яны выконваюць сацыяльны заказ кансерватыўных сіл у Беларусі. Зразумела, тут патрэбна зыходзіць з таго, што журналісты адлюстроўваюць перш за ўсё свае ўяўленні аб свеце, а таксама тых сіл, якія стаяць за імі.

І ў той жа час наіўна лічыць, што з дапамогай сродкаў масавай інфармацыі магчыма пазбегнуць усіх супярэчнасцей у грамадстве. Устараненне памылковых уяўленняў са свядомасці людзей, як адзначаў К. Маркс, дасягаецца не тэарэтычнымі дэдукцыямі, а змяненнем умоў, вынікамі дзейнасці чалавека [15].

У працэсе дзейнасці, як і ў працэсе свядомасці, даследчыкамі вылучаюцца тры асноўныя этапы. Гэта этап адлюстравання рэчаіснасці, этап канструктыўнай дзейнасці, а таксама этап, у якім свядомасць выступае ў функцыі рэгулятара самой практычнай дзейнасці. Аб'ектыўна наша грамадства, як і сродкі масавай інфармацыі, толькі-толькі перайшлі да другога этапу. Адсюль і вынікаюць усе супярэчнасці чалавечага фактару і СМІ. Бо самі сродкі масавай інфармацыі з'яўляюцца формай дзейнасці грамадскай свядомасці, інакш кажучы формай праяўлення чалавечага фактару. Таму і паўстала пытанне аб павышэнні сацыяльнай адказнасці СМІ перад грамадствам. Але рост іх адказнасці ні ў якім разе не павінен прывесці да скарачэння альбо абмежавання інфармацыі, бо тады прэса, радыё, тэлебачанне не будуць выконваць сваю асноўную функцыю — кіруючую.

[1] Гл.: Вечерний Минск. 1991. 30 янв.
[2] Гл.: Добры вечар. 1991. 15 лют.
[3] Гл.: Маркс К., Энгельс Ф. Соч. Т. 42. С. 118.
[4] Маркс К., Энгельс Ф. Выбраныя творы. Мн., 1952. Т. 2. С. 160.
[5] Криворотов В. Утраченные альтернативы // Знание — сила. 1990. № 3. С. 5.
[6] Левада Ю. Размышления вслух // Знание — сила. 1989. С. 12.
[7] Гл.: Ленін У. І. Творы. Т. 26. С. 244.
[8] Ануфриев Е. А., Волков Ф. М. и др. Человеческий фактор прогресса социализма: сущность и проблемы. М., 1989. С. 9.
[9] Маркс К., Энгельс Ф. Соч. Т. 1. С. 414.
[10] Гл.: Ануфриев Е. А., Волков Ф. М. Человеческий фактор... С. 6.
[11] Маркс К., Энгельс Ф. Выбраныя творы. Т. 2. С. 417.
[12] Федякин И. А. Общественное сознание и массовая коммуникация в буржуазном обществе. М., 1988. С. 19.
[13] Гл.: Горшков М. К. Общественное мнение. М., 1988. С. 303.
[14] Гл.: Дубовик В. И., Осинская Л. Н. и др. Эффективность партийной публицистики. Мн., 1986. С. 110.
[15] Гл.: Маркс К., Энгельс Ф. Соч. Т. 3. С. 39.

О. Г. СЛУКА

## МОЛОДЕЖНАЯ ПЕЧАТЬ БЕЛОРУССИИ НА ЕВРЕЙСКОМ И ПОЛЬСКОМ ЯЗЫКАХ

После Октябрьской революции в Белоруссии сложились условия для равноправной жизнедеятельности всех народов, проживающих на ее территории, их участия в социальных процессах и развития национальных культур. Создавались просветительские общества, открывались школы и клубы. Еврейская молодежь объединилась в организациях «Югенд-бунд», «Поалей-цион», «Евкомол»[1].

Для развития национального сознания и формирования общественно-политической позиции молодежи, широкого информирования о происходящих событиях создавались специальные газеты и журналы. В 1919 г. ЦК комсомола Литвы и Белоруссии принял постановление об издании страничек в партийных газетах «Млот» (польск.) и «Комунистише штиме» — органе Минского бюро евкомола, которая выходила с 8 апреля по 15 мая 1919 г. На страничках «Красной молодежи», в белорусских и русских газетах также печатались материалы о жизни юношей и девушек нацменьшинств. Это было началом образования национальных молодежных изданий в республике.

В 1920 г. в Витебске начинает печататься журнал «Хвалес» — орган еврейского бюро при Витебском губкоме РКСМ. Это первое крупное издание еврейской молодежи в нашей стране. Журнал имел политическую и культурологическую направленность, вовлекал молодежь в революционную работу, выступал против национализма, знакомил читателей с народными обычаями, бытом и литературой. Однако выходил он не регулярно и не мог оперативно информировать читателей о бурных событиях гражданской войны. В 1920 г. напечатаны только № 1—2, а в 1921 г.— № 2—3.

Исходя из этого, Витебский губком комсомола преобразовал журнал в газету под тем же названием. Газета «Хвалес» выходила с 3 марта 1921 г. до конца 1922 г. Напечатано 106 номеров на двух и частично на четырех полосах форматом «Правды». Кроме широкой общественно-политической и социально-бытовой информации, в газете много места отводилось разъяснению целей и задач коммунистических и националистических молодежных организаций, привлечению юношей и девушек в комсомол.

Региональные издания имели ограниченное распространение и относительно узкую информацию, поэтому необходимо было организовать издание республиканской газеты для еврейской молодежи. 27 июля 1920 г. ЦК КСМЛиБ решил создать газету «Коммунистише югнт» — орган ЦК КСМ и главного бюро еврейской секции Белоруссии, первый номер которой вышел 20 мая 1921 г. Новая газета ориентировала читателей на участие в восстановлении народного хозяйства, борьбу с бандитизмом, эксплуатацией на частных предприятиях, усиливающейся безработицей среди еврейской молодежи. Однако редакция «Коммунистише югнт» не смогла преодолеть общих недостатков: газета была бедно оформлена, выходила нерегулярно, имела ограниченный круг читателей. Поэтому 29 сентября 1922 г. газета прекратила существование.